**Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка
імя А. Макаёнка**

# ЗОРКА АЛЯКСАНДРА ШЫДЛОЎСКАГА




Бібліяграфічны спіс

Гродна–2016

Зорка Аляксандра Шыдлоўскага : бібліяграфічны спіс / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сісітэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка ; уклад. І. М. Ілюшына. – Гродна, 2016. – 11 с.

*Спіс складзены да 105-годдзя з дня нараджэння Шыдлоўскага Аляксандра Канстанцінавіча, знакамітага беларускага культурнага дзеяча, кампазітара, педагога, паэта, Ганаровага грамадзяніна Гродна і Смаргоні. Крыніцы інфармацыі змяшчаюць звесткі аб жыцці, прафесійнай і грамадскай дзейнасці.*

# ШЫДЛОЎСКІ АЛЯКСАНДР КАНСТАНЦІНАВІЧ
(1911–2002)

Беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва, кампазітар, педагог, паэт, заслужаны дзеяч культуры БССР (1960), Ганаровы грамадзянін Гродна і Смаргоні, аўтар вядомых песень, стваральнік песенных калектываў, узнагароджаны медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў»



Нарадзіўся 18 чэрвеня 1911 года ў вёсцы Мінкі Смаргонскага раёна Віленскай губерніі (Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці) ў беднай сялянскай сям'і.

Падчас Першай сусветнай вайны разам з бацькамі эвакуіраваўся ў горад Сімбірск (1914–1921). З малодшай сястрой Надзеяй вучыліся там у школе-інтэрнаце імя Карла Маркса. У 1923 годзе сям'я вярнулася на радзіму. Вёска была спалена, жылі ў нямецкіх бліндажах, пакуль не

пабудавалі дом. Аляксандр скончыў сямігадовую польскую школу.

У 1927 годзе паступіў у Віленскую беларускую гімназію і пазнаёміўся з беларускімі дзеячамі міжваеннага часу – Р. Шырмай, С. Паўловічам, М. Гарэцкім, С. Станкевічам. У гімназіі далучыўся да падпольнага беларускага камуністычнага руху. Стаў членам падпольнай арганізацыі – Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). За гэта яго выключылі з гімназіі (1929). У 1928 годзе стаў інструктарам беларускага парламенцкага клуба ў польскім Сейме «Змаганне». У 1930 годзе быў дэлегатам сялянскага кангрэса моладзі ў Берліне.

За рэвалюцыйную дзейнасць у 1930 годзе арыштаваны і прыгавораны Віленскім акруговым судом да 5 гадоў турэмнага заключэння і пазбаўлення грамадзянскіх праў на 10 год (1931–1936). Потым працаваў на сезонных работах у Вільні, Варшаве (на вугальным складзе, у псіхіятрычнай бальніцы, на будаўніцтве). У 1937 годзе зноў трапляе ў турму.

У 1938 годзе А. Шыдлоўскі разам са сваім братам Язэпам Урбановічам ствараюць апошнюю ў Польшчы легальную беларускую арганізацыю – Беларускае культурнае таварыства ў Варшаве. Арганізацыя вяла вялікую патрыятычную работу сярод беларускіх рабочых у Варшаве. Адначасова А. Шыдлоўскі збіраў

беларускія народныя песні, апрацоўваў іх, спяваў як удзельнік хора.

У верасні 1939 года пасдя ўз’яднання Заходняй і Усходняй Беларусі  вярнуўся ў родную вёску. У пачатку 1940 года паехаў у Беласток, дзе Рыгор Раманавіч Шырма (1892–1978), стварыў Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца. Аляксандр Шыдлоўскі стаў артыстам-салістам гэтага ансамбля, які ўсю Вялікую Айчынную вайну абслугоўваў работнікаў тыла, раненых у эвакуацыйных шпіталях, воінаў 1-га і 2-га Беларускіх франтоў, паспяхова выконваў баявую задачу маральнай падтрымкі воінаў музычнымі сродкамі. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (чэрвень 1944) ансамбль пераехаў ў Мінск, восенню 1944 года заснаваўся ў Гродна, а ў 1952 годзе ансамбль быў канчаткова пераведзены ў Мінск, дзе атрымаў статут Дзяржаўнага хора БССР, а пазней – Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР. Аляксандр Шыдлоўскі застаўся ў Гродна.

У 1950 годзе скончыў завочна гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. З 1951 года быў настаўнікам музыкі і спеваў сярэдняй школы № 10 Гродна, кіраваў вучнёўскім хорам, многімі вакальнымі аб’яднаннямі на прадпрыемствах горада.

У 1960–1995 гадах працаваў у Гродзенскім абласным Доме народнай творчасці ( з 1991 года гэта Гродзнскі абласны навукова-метадычны Цэнтр народнай творчасці (ГАНМЦНТ)). У 1960 годзе стаў яго дырэктарам (да 1970) і атрымаў званне «Заслужаны дзеяч культуры БССР». У 1972–1995 гадах быў вядучым спецыялістам ГАНМЦНТ.

Яго дзейнасць ў значнай меры вызначала шляхі развіцця музычнай і народнай творчасці Прынеманскага краю. У 1965 годзе па ініцыятыве і пры актыўным садзейнічанні А.К. Шыдлоўскага адкрыўся музей сучаснага народнага і самадзейнага мастацтва пры Доме народнай таорчасці (затым ГАНМЦНТ, цяпер Дзяржаўная ўстанова культуры «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці»).

Блізкасць да народных вытокаў натхняла кампазітара А. Шыдлоўскага на сачыненне выдатных песень. Арганізатар харавых калектываў, у тым ліку, адзін з арганізатараў хора ансамбля песні і танца "Нёман", А. Шыдлоўскім было створана болей 200 песень. Аўтар песень «Гродзенскі вальс», «Ой ты, Нёман родны», «Песня пра Гродна», «Колькі ў небе зор», «Сонца яснае ўзышло», «Там, дзе Нёман плыве» і інш. Першы зборнік (Аляксандра Шыдлоўскага «Песні» (32 песні) быў выдадзены ў 1964 годзе, другі «Ляці, наша песня» (28 песень) – у 1990 годзе. Вакол

Аляксандра Канстанцінавіча групавалася цэлая плеяда кампазітараў-песеннікаў 1950–60-х гадоў: Павел Радаліцкі, Антон Валынчык, Яўген Петрашэвіч, Марк Коп і інш.

Беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва, кампазітар, педагог, паэт. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1960). Узнагароджаны ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», шматлікімі граматамі і дыпломамі Міністэрства культуры СССР і БССР.

26 жніўня 1987 года Шыдлоўскаму Аляксандру Канстанцінавічу рашэннем выканаўчага камітэта Гродзенскага гарадскога Савета народных дэпутатаў № 46 прысвоена званне «Ганаровага грамадзяніна горада Гродна» за вялікі ўклад у развіццё культуры горада Гродна. У 1993 годзе – «Ганаровага грамадзяніна горада Смаргоні».

У апошнія гады Аляксандр Канстанцінавіч Шыдлоўскі жыў на вуліцы Савецкіх пагранічнікаў ў Гродна. Памёр 26 верасня 2002 года. Пахаваны ў Гродна на могілках ва урочышчы «Сакрэт». У мікрараёне Зарыца горада Гродна ёсць вуліца, якая носіць яго імя. На фасадзе будынку дома народнай творчасці на вуліцы Савецкай, 8, дзе раней працаваў Аляксандр Шыдлоўскі, устаноўлена памятная дошка

(скульптар У. Панцялееў). Заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі У. Церабун, зямляк кампазітара, які добра ведаў яго і ўгаварыў пазіраваць, стварыў скульптурны партрэт А. Шыдлоўскага ў гіпсе. Работа экспанавалася на шматлікіх выставах ў Гродна і Смаргоні і мела поспех.

# БІБЛІЯГРАФІЯ

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18. Кн. 1. – С. 8.

Шидловский Александр Константинович // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Мінск, 1982. – Т. 5. – С. 692.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Беларускі фальклор : энцыклапедыя [у 2 т.]. – Мінск, 2008. – С. 772.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Беларусь : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 774.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1987. – Т. 5. – С. 603.

Долготович, Б. Д. Шидловский Александр Константинович [1911–2002] / Б. Д. Долготович // Долготович Б. Д. Почетные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 206–207.

Ганаровыя грамадзяне горада Гродна ў пасляваенны перыяд. Шидловский Александр Константинович // Памяць : гісторыка–дакум. хроніка горада Гродна / рэд. кал. : Г. П. Пашкоў, Я. М. Жабрун, І. П. Крэнь і інш. – Мінск, 1999. – С. 683.

Круціна, Т. І. Заслужаныя работнікі культуры і заслужаныя дзеячы мастацтваў. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч / Т. І. Круціна, Э. С. Ярмусік // Памяць : гісторыка-дакум. хроніка горада Гродна / рэд. кал. : Г. П. Пашкоў, Я. М. Жабрун, І. П. Крэнь і інш. – Мінск, 1999. – С. 635–636.

Шидловский А. К. (1911–2002) // Госцеў А. П. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.) / А. П. Госцеў, В. В. Швед. – Гродна, 1993. – С. 274.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Культура Гродзеншчыны : Факты. Падзеі. Асобы / уклад. Л. В. Мальцава.– Мінск, 2014.– С. 54–55.

Пяткевіч, А. М. З матчыным словам і песняю // Пяткевіч А. М. Старонкі спадчыны : культурнае памежжа Гродзеншчыны : працэсы, з'явы, асобы. – Мінск, 2006. – С. 181–183.

Падаляк, Т. Гродзенскі вальс Аляксандра Шыдлоўскага: краты не заслоняць зор… / Таццяна Падаляк ; фота // Падаляк Т. Дыялогі на мяжы стагоддзяў: класікі і сучаснікі ў інтэр'еры часу / Таццяна Падаляк. – Мінск, 2013. – С. 47–52.

[Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч] // Шумская І. Музыка ў кантэксце беларуска-польскага міжкультурнага ўзаемадзеяння : манаграфія / Ірына Шумская. – [Мінск : Медысонт, 2011]. – С. 68–71.

Добрыдзень, І. Песня застаецца з чалавекам : 100-годдзе з дня нараджэння А. Шыдлоўскага / Іна Добрыдзень // Рэспубліка. – 2011. – 7 ліпеня. – С. 8.

Кожух, Н. Зорка Шыдлоўскага : [да 100-годдзя паэта і кампазітара Аляксандра Канстанцінавіча Шыдлоўскага] / Ніна Кожух // Перспектива. – 2011. – 22 июня (№ 47). – С. 4.

Турмасава, Л. Без песні чалавек бяскрылы : [аб паэце і кампазітары Аляксандры Канстанцінавічы Шыдлоўскім] / Любоў Турмасава // Літаратура і мастацтва. – 2013. – 23 жніўня (№ 33). – С. 13.

Турмасава, Л. На ўсё жыццё крылаты : [пра паэта і кампазітара Аляксандра Канстанцінавіча Шыдлоўскага] / Любоў Турмасава // Культура. – 2013. – 13 ліпеня (№ 28). – С. 14.

Турмасава, Л. Непагасная зорка Аляксандра Шыдлоўскага / Любоў Турмасава // Краязнаўчая газета. – 2013. – № 35. – С. 2, 5.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч [Электронный ресурс] // Почетные граждане – Гродненский городской исполнительный комитет: официальный Интернет-портал.– Режим доступа: http://grodno.gov.by/ru/main.aspx?guid=2071. – Дата доступа: 30.08.2016.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki. – Дата доступу: 30.08.2016.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Сморгонский районный исполнительный комитет: официальный сайт. – Режим доступа: http://www.smorgon.grodno-region.by/ru/region/new_url_19017. – Дата доступа: 30.08.2016.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага. Легенды Гродзеншчыны : галерэя знакамітых асоб. – Рэжым доступу: http://grodnolib2.by/html/Shydlowski_Aljaksandr_Kanstancinavich.html.php. – Дата доступу: 30.08.2016.

# Зорка Аляксандра Шыдлоўскага

Бібліяграфічны спіс

Складальнік
Ілюшына Інэса Мікалаеўна